ФІЛАСОФІЯ

УДК 1:316.614

П.В. Кікель,
доктар філасофскіх навук, прафесар кафедры філасофіі БДПУ,

С.А. Азардовіч,
аспірант кафедры філасофіі БДПУ

МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ РЭФАРМАВАННЯ СУЧАСНАЙ АДУКАЦЫІ

Крызіс адукацыі і выхавання як адлюстравання духоўнай сітуацыі нашага часу – «крызіс сэнсу» – заключаецца ў немагчымасці ліквідаваць цяжкасці выбару і азначэння жыццёвых мэт і ідэалаў ва ўмовах «інфармацыйнай» цывілізацыі. Пад інфармацыйным соцыумам мы разумеем такое грамадства, дзе захоўванне і перадача інфармацыі з'яўляецца ўмовай паспяховай вытворчасці матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей па зададзенай тэхналогіі. Менавіта ў такім семіятычным плане варта падыходзіць да аналізу супярэчнасцей, што склаліся ў сучасным свеце. Аб'ектыўны і неадназначны характар працэсаў, якія адбываюцца ў соцыуме ў пачатку XXI ст., абумоўлены, з аднаго боку, імклівым ростам выкарыстання інтэлектуальных тэхналогій і змяненнем характару і зместу асноўнага грамадскага прадукту. Калі раней лад эканомікі і сутнасць вытворчых адносін вызначалі ствараемыя грамадствам матэрыяльныя каштоўнасці, то ў новых умовах у якасці галоўнага грамадскага прадукту першаснае значэнне набываюць сацыяльныя веды, якія вызначаюць спецыфіку і характар усіх тэхналогій [4, с. 275].

З іншага боку, практычнае вырашэнне сацыяльных праблем адбываецца з розных тэарэтыка-метадалагічных і маральна-этычных пазіцый, звязаных са змяненнем функцыянальнасці чалавека і задавальненнем яго патрэб. Гэты сістэмны крызіс закрануў многія бакі чалавечай дзейнасці і актуалізаваў на рубяжы стагоддзяў і тысячагоддзяў праблемы сацыяльнай адукацыі, прымусіўшы філосафаў асэнсаваць заканамернасці яго развіцця і функцыянавання ў сучасных умовах. Аб'ём артыкула дазваляе нам толькі паказаць праблему сацыялізацыі адукацыі, асэнсаваць яе як падсістэму складана-структураванай цэласнай сістэмы.

Мы канстатуем, што ў наш час у адукацыі адбыліся і адбываюцца змены, якія можна назваць рэвалюцыйнымі. Яны абумоўлены наступнымі прычынамі:

Па-першае, сацыяльнымі зменамі, што адбываюцца ў духоўных сферах жыцця чалавецтва, такіх як філасофія, рэлігія, палітыка.

Па-другое, зменамі, якія адбываюцца ў плоскасці маральна-этычных адносін, у самой дзейнасці чалавека.

Па-трэцяе, імклівым ростам выкарыстання інтэлектуальных тэхналогій у пазнанні і практыцы.

Па-чацвёртае, радыкальным зменам суб'ектыўных мэтанакіраваных установак [4, с. 297].

Аднак не можа застацца незаўважаным той факт, што адукацыйная практыка не адпавядае ні запатрабаванням, ні магчымасцям сучаснага грамадства, што выяўляецца ў наступным:

- Панаванне інфармацыйнага падыходу, гэта значыць трансляцыя аб'екту (вучню) максімальна магчымага аб'ёму інфармацыі, часта нават без асэнсаванага разумення.
- Адгэтуль ідзе сафізм і схаластычнасць, гэта значыць навязванне зубрэння без асэнсавання і разумення.
- У якасці аргумента «за» або «супраць» той ці іншай сацыяльнай з'явы служыць меркаванне «класіка», выказанае ў тэксце, што прыводзіць да герменеўтычнага талмудызму і асемантычнасці.
- Інавацыйныя памкненні не маюць асэнсаванай канцэптуальнай асновы, што азначае захапленне новай формай пры захаванні старога зместу.

Усё гэта вядзе да алагічнасці, архаічнасці і адсталасці адукацыйнага працэсу. Тым не менш, сёння большасць даследчыкаў адукацыйнай тэорыі і практыкі ўсвядомілі той факт, што эфектыўным механізмам ўдасканалення адукацыі як адной з падсістэм грамадства з'яўляецца працэс матэматызацыі. Сапраўды, у жыццё чалавека імкліва ўварваліся тэхналогіі, заснаваныя на матэматыка-метадалагічным інструментарыі. Матэматыка і пазнанне ўзаемадзейнічаюць і складаюць адзінае цэлае – шматфункцыянальную сістэму ідэальнага і матэрыяльнага асваення свету чалавекам [3]. Аксіёмай з'яўляецца палажэнне аб тым, што матэматызаваныя веды – вырашальны фактар дынамічнага развіцця тэхнікі, прадукцыйных сіл, спосабу вытворчасці. Аднак лічым, што не з'яўляецца гіпотэзай іншая наша здагадка –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стварыўшы магутны фактар вытворчасці матэрыяльных каштоўнасцей, чалавек не здолеў асэнсаваць таго, што ён стварыў. На наш погляд, сучасны чалавек неадэкватна ўсведамляе сваё месца, ролю ў свеце і ўзаемаадносіны з ім. Паспрабуем зразумець прычыны гэтай неадпаведнасці. З гэтай мэтай разгледзім сістэму ўзаемаадносін паміж Прыродай, Грамадствам і Чалавекам.

Гісторыя сучаснага чалавецтва налічвае 300 тыс. гадоў. Першыя калектывы з'явіліся 50–70 тыс. гадоў таму, гэта значыць можна сцвярджаць, што вялікую частку гістарычнага часу чалавек фарміраваўся біялагічна, пазнаючы свет у пачуццёвых формах. Гэты этап у развіцці чалавечай супольнасці можна назваць інфармацыйным, бо вынікам пазнання свету чалавекам, галоўным чынам, была інфармацыя аб ім, з дапамогай якой чалавек кіраваў сваімі паводзінамі ў яго пераўтварэнні. Гэта можна прадставіць наступным чынам:



Але спосабы вытворчасці, заснаваныя на інфармацыі, недасканалыя, іх паляпшэнне ішло адзіным шляхам – шляхам асваення свету на аснове ведаў. Навука з формы апісання навакольнага асяроддзя стала ператварацца ў форму пераўтварэння. Змяніўся кірунак адносін паміж чалавекам і светам, іх характар:



Усведамленне гэтых фактараў дазваляе зрабіць выснову аб тым, што Чалавек, Прырода і Грамадства ў адзінстве павінны ўтвараць гарманічную сістэму ў выглядзе:



На наш погляд, галоўнай канцэптуальнай памылкай многіх тэарэтычных канструктаў сацыяльнага развіцця ў мінулым была абсалютызацыя адносін з шасці складовых: Прырода – Чалавек; Чалавек – Прырода; Чалавек – Грамадства; Грамадства – Чалавек; Прырода – Грамадства; Грамадства – Прырода. На самой справе яны, па сваёй прыродзе, знаходзяцца ў адзінстве і цэласнасці, складаючы гармонію Свету. Пераадолець наступствы гэтых памылак – задача сучаснай сацыяльнай адукацыі, аб якой можна казаць толькі ў будучым часе.

Прапануем сваю суб'ектыўную мадэль яе пабудовы. Па-першае, яна павінна быць гарманічнай і цэласнай сістэмай як навуковае адлюстраванне Сусвету. Чалавецтва непазбежна павінна пачаць будаваць навуковы этап свайго ўзаемадзеяння са светам. Ад «інфармацыйнага» грамадства мы абавязаны перайсці да «навуковага» ўжо ў сучаснасці. Часу для сумненняў практычна не засталося. Гарманічнае адзінства чалавека з грамадствам і прыродай можна пабудаваць толькі на аснове ведаў. У сучаснай гуманітарнай адукацыі можна бачыць метадалагічныя памылкі, якія памяншаюць яго навуковы статус. Галоўная з іх ляжыць у плоскасці перадачы сацыяльных ведаў як набору абстрактных меркаванняў, што зводзіць раскрыццё сацыяльных з'яў да сузіральнага апісання. Мы лічым, што толькі тлумачэнне і разуменне з'яўляюцца дзвюма ўзаемадапаўняльнымі супрацьлегласцямі сучаснага адукацыйнага працэсу.

Тлумачэнне ў самай агульнай форме можна вызначыць як падвядзенне канкрэтнага факта пад пэўны закон або тэорыю. Пад тэрмінам «факт» маецца на ўвазе меркаванне або выказванне аб рэальнай з'яве ці падзеі, «падвядзенне» варта трактаваць як лагічны вывад з закона або тэорыі. У выпадку станоўчага выніку ён становіцца «навуковым фактам». Навуковы факт – гэта свядомае засваенне законаў логікі, семантыкі і прагматыкі. Іншымі словамі, разуменне выступае формай свядомага асваення навуковага факта як ведаў. У адпаведнасці з дыялектыка-матэрыялістычнай гнасеалогіяй, якая з'яўляецца сёння, па нашаму разуменню, метадалогіяй навуковага пазнання, «свядомасць не толькі адлюстроўвае аб'ектыўны свет, але і творыць яго» [6, с. 3]. Такая перадумова можа стаць рэчаіснасцю толькі ў тым выпадку, калі пераўтваральную ролю свядомасці пачнуць разглядаць на ўзроўні практыкі, прадметных адносін чалавека да навакольнага асяроддзя. У метадалагічным жа плане свядомасць губляе свой пераўтваральны, прадметна-практычны характар. У сувязі з гэтым ёсць сэнс казаць толькі аб тым, што свядомасць складае аснову рацыянальнага пазнання, але не зводзіцца да пазнання як духоўнага працэсу асваення аб'ектыўнага свету чалавекам. Свядомасць уяўляе ідэальную копію з'яў, адлюстраванне якіх можа адбывацца на ўзроўні пачуццёвага ўспрымання. Пазнанне выказвае іншы, больш высокі ўзровень псіхалагічнай дзейнасці і ўяўляе сабой яе вынік – сістэму навуковых ведаў, у якой рэальнасць рэпрэзентуе праз практыку, з дапамогай актыўнага асваення аб'екта суб'ектам.

Свядомасць адрозніваецца ад пазнання таксама па сваім змесце і функцыянальнай ролі. Свядомасць ёсць суб'ектыўны вобраз

РЕПОЗИТОРИЙ ВГТУ

аб'ектыўнага свету, яго духоўная рэпрэзентацыя. Пазнанне ўяўляе дзейнасць па духоўным асваенні аб'ектыўнага свету. Свядомасць можа быць пасіўным працэсам, тады як пазнанне, прадметнае і мэтанакіраванае, уключае практыку і актыўныя дзеянні суб'екта, арыентаваныя на пераўтварэнне рэальнасці. Гэта не фенаменалагічны вобраз аб'ектаў, а веданне аб іх, прычынах іх існавання і развіцця.

Калі паставіць знак роўнасці паміж свядомасцю і пазнаннем, то можна прыйсці да памылковай высновы, што інтэрпрэтацыя і тлумачэнне сутнасна роўныя катэгорыі. Паняцце «тлумачэнне» было разгледжана вышэй. Пад інтэрпрэтацыяй сёння разумеюць раскрыццё першапачатковага сэнсу меркаванняў і выказванняў, раскрыццё мэт, матывацый, дзеянняў і ўчынкаў людзей, якія апелююць гэтымі меркаваннямі і выказваннямі. Такое разуменне нічым практычна не адрозніваецца ад тэалагічнай інтэрпрэтацыі. Лічыцца, што калі мы раскрыем гэты сэнс, то тым самым зразумеем яго. З гэтым, у пэўным сэнсе, можна пагадзіцца, калі гаворка ідзе не пра навукоўцаў, а пра перакладчыкаў. Для большасці з іх і ў XX ст. галоўнай мэтай было зрабіць пераклад без скажэнняў і ўласных меркаванняў, данесці да чытачоў сэнс аўтарскага тэксту. Прыпадобніцца да іх – роўнае смерці. Бо, калі мы будзем раскрываць толькі аўтарскі сэнс, то ўсё звядзецца да бесперапыннага рэпрадукавання таго ж сэнсу. Мы лічым, што ў адрозненне ад інтэрпрэтацыі, тлумачэнне грунтуецца на больш шырокай і развітой пазіцыі, у якую ўваходзяць веды і вопыт новых пакаленняў, яно дае навуковае ўяўленне не толькі аб тым, што было, але і абгрунтоўвае сутнасць з'явы, дае магчымасць прадказваць будучыню.

Але кірунак думкі, які падвяргае крытыцы «свядомасць як люстэрка» і надае асаблівую ўвагу лінгвістычным, знакавым, інтэрпрэтацыйным аспектам філасофіі, таксама надзвычай важны для выпрацоўкі цэласнага светапогляду. Сучасная фізіка, асабліва фізіка мікрасвету, а таксама кагніталогія (міждысцыплінарнае прыродазнаўчае вывучэнне свядомасці і пазнання) недвухсэнсоўна паказвае на тое, што спараджальныя намі знакавыя сістэмы вельмі апасродкава і скажона адлюстроўваюць рэальнасць. Гэта датычыцца нават такіх рыгарыстычных знакавых сістэм, як вышэйшая матэматыка, асабліва тых яе раздзелаў, якія абслугоўваюць пярэдні край фізічнай і біялагічнай навукі. Па сутнасці, у такой выяве яна з'яўляецца ўсяго толькі штучным з лімітава развітым сінтаксісам і з мінімальнай лексікай мовы.

Па-за ўсякім сумненнем, чалавечая свядомасць мае свой падмурак у рэальным свеце і з'яўляецца фактам рэчаіснасці, аднак адначасова яна з'яўляецца дынамічна рухомай інтэрпрэтацыяй гэтага свету і самога сябе. І не ўсяго свету, а толькі яго «чалавечай частаты», якая непарыўна пераплецена з іншымі «частотамі», неістотнымі для нашага выжывання і паспяховага дзеяння ў ім. Арыентацыя тэорыі пазнання павінна грунтавацца на сакратычным «я ведаю, што нічога не ведаю», на ўсведамленні прынцыповай непаўнаты ўсіх папярэдніх пабудоў, нават калі на іх аснове атрымоўваецца ствараць больш-менш дзейсныя тэхналогіі і складаныя артэфакты. Гэту ідэю можна выказаць афарыстычна: «Калі вам здаецца, што вы стварылі саму дасканаласць, значыць, вы проста не ведаеце заганаў вашай тэорыі». Да таго ж, працэс знаходжання паралеляў паміж знакавымі сістэмамі павялічвае колькасць нейронавых сувязей у мазгах, што вядзе да паляпшэння інтэлектуальных здольнасцей і да агульнага паляпшэння здароўя чалавека.

Іншым важным фактам, які аргументуе неабходнасць развітой здольнасці адукаваных людзей да інтэрпрэтацый, з'яўляецца культурная глабалізацыя, якая адкрывае межы паміж носьбітамі розных знакавых сістэм, павышае магчымасці міжкультурнага разумення для дасягнення агульных мэт.

Вышэйсказанае з'яўляецца канкрэтызацыяй палажэнняў матэрыялізму як універсальнага навуковага метаду, паказвае неабходнасць напаўнення яго новым зместам, адпаведным разуменню праблем матэрыяльнага і рэальнага ў сучаснай навуцы, якая развіваецца. Якасная адукацыя, якая б развівала людзей як у прафесійным, так і ў асобасным плане, павінна адпавядаць прынцыпу навуковасці, узбройваць навучэнцаў інтэнсіўнымі, а не экстэнсіўнымі, схаластычнымі метадамі пазнання. Зыходзячы з гэтага сцвярджэння, мы лічым, што мэтай адукацыі, як адной з падсістэм грамадства, з'яўляецца ўсебаковае развіццё асобы. Бо наша грамадства ў сваім паступальным руху падышло да навуковага спосабу стварэння сацыяльных патрэб і выпрацоўкі на іх аснове новых каштоўнасцей, якія сцвярджаюць стаўленне да чалавека як да іх творцы.

Сёння становіцца зразумелым, што чалавек не толькі адказны за захаванне і прымнажэнне спадчыны мінулага, але і датычны да ўсяго таго, што адбываецца ў сучасным грамадстве, у якое ён сацыяльна ўключаны. Таму сацыялізацыя адукацыі разглядаецца як фактар развіцця адносін у шырокай цэласнай сістэме «соцыум – вучань», у якой сённяшняя сістэма «настаўнік – вучань» выступае як функцыянальна абумоўленая падсістэма. На наш погляд, сацыялізацыя адукацыі ўяўляе сабой актуальную праблему, на вырашэнне якой павінны быць накіраваны намаганні ўсіх сфер духоўнай вытворчасці, а не толькі адукацыі. Толькі намаганнямі ўсяго соцыуму сістэму падрыхтоўкі «абітурыента» ў школе і «спецыяліста» ў вышэйшай навучальнай установе можна ператварыць у сістэму падрыхтоўкі асобы, якая ўсведамляла б сваё месца і ролю ў свеце і адказна б ставілася да сваёй і яго будучыні, а прафесію настаўніка – вучыць вучня, патрэбна ператварыць у прафесію аду-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

катара – тварыць асобу. Яе метадалагічнае рашэнне бачыцца намі наступным чынам:



У наш надзвычай складаны час, калі наспявае чарговы якасны скачок у развіцці навукі і тэхналогій, адукацыя павінна вучыць правільна фармуляваць пытанні і шукаць на іх адказы, а не слепа ўспрымаць і памнажаць догмы. Гэты пошукавы элемент, разам з развіццём крытычнасці розуму, не павінен, тым не менш, абсалютызавацца. Вялікая ўвага павінна надавацца таму, каб зберагчы маладое пакаленне ад «вынаходства ровара», хоць такія спробы не павінны аўтарытарна спыняцца – хто ведае, магчыма «вынаходзячы ровар», які-небудзь юны геній па шчаслівай памылцы вынайдзе міжзоркавы рухавік.

Такім чынам, сацыялізацыя адукацыі ўяўляе сабой супярэчлівы працэс развіцця асобы на аснове адзінства фарміравання высокай культуры навуковага пазнання свету і павышэння прагматычнай складовай атрыманых ведаў да магчымага максімуму.

Літаратура

1. Белорусский путь / под ред. О.В. Пролесковского и Л.Е. Криштаповича. – Минск, 2010. – 495 с.
2. Декларация тысячелетия ООН. – Минск: Юнипак, 2002.
3. *Кикель, П.В.* Математика и философия: монография / П.В. Кикель. – Минск: Змицер Колас, 2010. – 303 с.
4. *Криштапович, Л.Е.* Беларусь и Россия: историческое и цивилизационное единство / Л.Е. Криштапович. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2006.
5. *Capra Fritjof.* The hidden Connection Integration the biological cognitive and social dimensions of life into a science of sustainability / F. Capra // New York, 2002. – 336 p.
6. *Маркс, К.* Тезисы о Фейербахе / К. Маркс // Сочинения: в 46 т. – 2-е изд. – М., 1950. – Т. 3. – С. 1–4.
7. Переоснащение мирового развития. Обзор мирового экономического и социального положения, 2010 год. Организация Объединенных Наций. – Нью-Йорк, 2010. – 38 с.
8. Республика Беларусь: общество, политика, экономика, люди / О.В. Пролесковский [и др.]; Информ.-аналит. Центр при Администрации Президента Республики Беларусь. – Минск: Белорусский Дом печати, 2010. – 296 с.

Summary

The position about necessity of socialization of education and scientific knowledge are proved in the article. The consequences of the practical use of scientific achievements have a catastrophic character and the reason of that firstly is, their absence of socio-methodological substantiation. The situation is that without a philosophical component it is impossible not only to choose the scientific research, definition of its purposes, but also the organization of research activities. For this reason, the main goal of education is concentration of efforts to formation of a person, who understands his responsibility for the future. Of course, it is only possible with strengthening of socialization of all educational process. Representation is based on the unity of the theoretical approaches underlying the scientific method, scientific facts and arguments, validated the historical process, not the kinds of scholastic postulates characteristic of modern social philosophy.

Паступіў у рэдакцыю 27.12.2012 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 1:37

А.В. Кузнецов,
кандидат философских наук, доцент кафедры философии БГПУ;
В.В. Кузнецов,
преподаватель кафедры философии БГПУ

ОСНОВНЫЕ СТРАТЕГИИ РАЗВИТИЯ СИСТЕМЫ ОБРАЗОВАНИЯ КАК ДУХОВНОЙ СФЕРЫ ИНФОРМАЦИОННОГО ОБЩЕСТВА

Эпиграфом к одной из своих статей, сыгравшей выдающуюся роль в становлении концепции информационного общества, Д. Белл приводит отрывок из стихотворения английского поэта XX в. Т. Элиота. В нем есть такие строки:

«О жизнь, растраченная в существовании…
О мудрость, утраченная в знаниях…
О знание, потерянное в информации…» [1, с. 330].

На наш взгляд, в этих словах Т. Элиота содержится глубокая критика тех стратегий образования, которые вытекают из концепции информационного общества.

Как известно, образование в широком смысле этого слова является системой воспроизводства социально-культурной матрицы определенного исторического типа общества. Если культура является своеобразным социокодом поведения и деятельности человека в обществе, то образование есть ничто иное как воспроизводство этого социокода в новых поколениях людей. Поэтому определенный тип обра-